# "Маладнякоўскімі крокамі"

*Выстава пад такой назвай адкрылася 16 студзеня 2020 года ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.*




Гэтая выстава падрыхтаваная ў рамках праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця" (2019—2023 гг.), які рэалізуецца да 100-годдзя з моманту заснавання літаб'яднання "Маладняк". Ініцыятарамі яго правядзення сталі Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва і Выдавецкі дом "Звязда" (часопіс "Маладосць").

"Маладняк" — першае прафесійнае згуртаванне пісьменнікаў 1920-х гг., дзейнасць якога значна паўплывала на развіццё беларускай літаратуры. Аб'яднанне ўзнікла ў 1923 г. як гурток маладых паэтаў пры аднайменным часопісе. Маладнякоўцы верылі ў свой талент і выключную місію стваральнікаў сапраўднай новай пралетарскай літаратуры.

Выстава "Маладнякоўскімі крокамі" прысвечана літаб'яднанню "Маладняк" і яго сябрам: Алесю Дудару, Адаму Бабарэку, Валерыю Маракову, Паўлюку Трусу, Міколу Хведаровічу, Максіму Лужаніну, Міхасю Лынькову, Уладзіміру Хадыку, Зінаідзе Бандарынай — пісьменнікам, чый юбілей прыпаў на 2019 — пачатак 2020 г.

На выставе можна пазнаёміцца з асобнікамі легендарнага часопіса творчай моладзі 1920—1930-х гг. "Маладняк" (з першага нумара 1923 г. па апошні 1932 г.), а таксама з альманахамі і перыядычнымі выданнямі шматлікіх рэспубліканскіх філій літаб'яднання і адметнай серыяй зборнікаў "Кніжніца "Маладняка". Унікальныя архіўныя дакументы, фотаздымкі, рукапісы літаратурных прац, нататкі, лісты, асабістыя рэчы, першыя публікацыі і зборнікі паэзіі і прозы адлюстроўваюць творчы шлях маладнякоўцаў-юбіляраў.

Упершыню ў адной экспазіцыі прадэманстравана спадчына маладнякоўцаў з фондаў трох устаноў-захавальніц — Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

Выстава "Маладнякоўскімі крокамі" будзе працаваць у **Музеі кнігі** Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі да **16 сакавіка 2020 г.**